М., 1989. – 48 с.
9. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал: І.П.Шамякін і інш. – Мн.: БелСЭ, 1986. – Т. 1: Акапела – Габелен. – 724 с.
10. *Яхонтова Е.С.* Музыкальный быт современного русского села: (На материале одной локальной традиции Поволжья): Автореф. дис. … канд. искусствоведения: (17.00.02; 09.00.09). – Л., 1985. – 21 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*П.Н.Епіхаў*

# ФЕНОМЕН ПАЛЕССЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Беларусь падзяляецца на шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Два з іх адносяцца да Палесся: Заходняе Палессе і Усходняе Палессе. Самыя старажытныя ўспаміны пра Палессе адносяцца да XIII ст., менавіта да 1276 г. Пад гэтай датай аўтар "Іпацьеўскага летапісу" адзначыў, што луцкі князь Мсціслаў Даніловіч вёў ваенны паход ад Капыля па Палессі. Лічыцца, што слова "палессе" паходзіць ад слова "лес" і азначае "край, што ляжыць пад вялікімі лясамі" [4, с. 20]. Праз яго праходзілі гандлёвыя шляхі з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход. Да канца 50-х гг. XX ст. Палессе было самым вялікім у Еўропе краем дрыгвы, лясоў, азёр і рэк. Яго лічылі мясцінай, якая была не толькі недаступнай, але нават і варожай чалавеку. Можна сказаць, што Палессе – гэта край, поўны таямніц, якія знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Гэты рэгіён і па сённяшні дзень тоіць шмат загадак. Тэрыторыя Палесся адносна адміністрацыйна-палітычнага дзялення краіны ахоплівае Брэсцкую, Гомельскую і паўднёвую частку Мінскай абласцей. Па плошчы Палессе займае амаль палову тэрыторыі Беларусі. Галоўнай ракой Палесся з'яўляецца Прыпяць з прытокамі Стыр, Тура, Гарынь, Убарць, Піна, Ствіга, Ясельда і інш.

На Палессі са старажытных часоў пражывалі славянскія плямёны. Гэтая акалічнасць з'явілася прычынай даволі працяглага па часе захавання архаічных рыс у культуры і побы-

це. Акрамя таго, геаграфічная ізаляванасць Палесся з-за вялікай колькасці густых лясоў і цяжкапраходнай дрыгвы перашкаджала ў пэўнай ступені пранікненню больш сучасных формаў матэрыяльнага і духоўнага жыцця насельніцтва Беларусі, адначасова з гэтым спрыяла адносна трываламу захаванню старажытных традыцый у матэрыяльнай і духоўнай культуры мясцовых жыхароў. Гэтыя абставіны рабілі Палессе аб'ектам пільнай увагі даследчыкаў славянскага этнагенезу.

Убачыць Палессе такім, якім яно было ў ранейшыя часы, сёння можна толькі дзякуючы фотаздымкам, апісанням і ўспамінам. Палескія землі цікавілі прадстаўнікоў розных навук. Даследаванні гэтага рэгіёну праводзілі геолагі, гідролагі, географы, этнографы, гісторыкі, мовазнаўцы, археолагі. Вынікі даследаванняў публікаваліся ў розных выданнях. Значная частка гэтых выданняў, фотаздымкаў і іншых матэрыялаў была страчана падчас другой сусветнай вайны. Але і па тых зборах матэрыялаў і калекцый, якія захаваліся, можна даведацца аб гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Палесся, а таксама аб унікальнасці гэтага рэгіёну.

Вывучэнне Палесся стала асабліва актуальным пасля чарнобыльскай аварыі. Мэтай этнаграфічных экспедыцый на Палессе з'яўляецца выяўленне і набыццё тых помнікаў гісторыі і культуры, якія захаваліся, і далейшая іх перадача ў музеі. Адбываецца працэсператварэння гэтых помнікаў у музейныя прадметы і экспанаты, інакш кажучы, музеефікацыя. Яна ўяўляе сабой працэс выяўлення, адбору і ўключэння ў склад музейнага збору помнікаў гісторыі і культуры, наданне статуса музейнага прадмета помнікам гісторыі і культуры, якія прайшлі ўсе стадыі навуковай апрацоўкі.

Беларускае Палессе – самабытны ў гістарычным, геаграфічным і этнаграфічным плане рэгіён. Ён здаўна стаў аб'ектам павышанай увагі даследчыкаў. У XIX ст. з'яўляюцца першыя навуковыя працы, прысвечаныя Беларускаму Палессю. У іх раскрываліся розныя аспекты матэрыяльнага і духоўнага жыцця: звычаі, традыцыі, абрады, вераванні, асаблівасці сямейных і грамадскіх адносін, спецыфіка народнага адзення, жылля, традыцыйных прылад працы і інш. У XX ст. колькасць навуковых даследаванняў павялічылася. З’явіліся працы, дзе знаходзілі адлюстраванне розныя бакі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйнай беларускай культуры ў яе агульных і рэгіянальных праявах. Найбольшую вядомасць у XIX–XX стст. атрымалі навуковыя працы такіх беларускіх даследчыкаў, як П.Шпілеўскі, А.Кіркор, І.Эрэміч, А.Сержпутоўскі, І.Сербаў. Вялікі ўклад у вывучэнне Беларускага Палесся ўнеслі таксама польскія і рускія даследчыкі. Зараз многія з вядомых прац беларускіх, рускіх і польскіх даследчыкаў Беларускага Палесся знаходзяцца ў архівах і бібліятэках Беларусі.

На працягу XX ст. на тэрыторыі Беларусі была створана сетка музеяў, дзе збіраліся помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры краіны. У некаторых з гэтых музеяў утрымліваюцца этнаграфічныя прадметы Беларускага Палесся. Яны адлюстроўваюць у значнай ступені спецыфіку дадзенага рэгіёну. У асноўным гэта прадметы матэрыяльнай культуры: мужчынскае і жаночае адзенне, прылады працы, сталярныя, цяслярскія, кавальскія інструменты, прадметы хатняга побыту, а таксама фотаздымкі, на якіх зафіксаваны праявы матэрыяльнага і духоўнага жыцця беларусаў-палешукоў. Усе гэтыя прадметы захоўваюцца ў фондах і экспазіцыях Музея Беларускага Палесся ў Пінску, Нараўлянскага этнаграфічнага музея, Музея народнай культуры Мазыршчыны (створаны на базе Мазырскага краязнаўчага музея), Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі і Музея старажытнабеларускай культуры ў Мінску. Асобную групу этнаграфічных матэрыялаў Беларускага Палесся складаюць жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы. Іх можна ўбачыць у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, які знаходзіцца недалёка ад Мінска. Помнікі матэрыяльнай культуры Беларускага Палесся ўяўляюць цікавасць і для спецыялістаў, і для наведвальнікаў. Што датычыцца духоўнай культуры гэтага рэгіёну, то яна адлюстравана ў меншай ступені, але гэта – натуральная з’ява, паколькі паказаць духоўную культуру праз музейную экспазіцыю складаней.

Музеі наладжваюць экспазіцыі, прапануюць наведвальнікам самае цікавае з тых матэрыялаў, якія маюцца ў іх фондах і экспазіцыях. Разам з тым на сённяшні дзень існуе праблема наватарскага падыходу да паказу этнаграфічных матэрыялаў, што павінна прыцягнуць увагу да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфічных экспазіцый і данесці да наведвальнікаў больш поўную інфармацыю аб традыцыйнай беларускай культуры.

---

*1. Лабынцев Ю.А.* В глубинном Полесье: Турово–Пинская земля. – М.: Искусство, 1989. – 158 с.: ил.

*2. Музей* и современность. Комплектование музейных коллекций. – М.: НИИК, 1982. – 144 с.

*3. Проблемы* формирования и изучения музейных коллекций. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1990. – 217 с.

*4. Polesie:* Fotografie z lat dwudziestych i trzydziestych / Instytut Sztuki Polskiej Akademii Nauk. – Warszawa, 1996.– 209 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ